■ Боегатоўнасць

# УЛАДАРЫ ЭФІРУ

## Спецыялісты радыёэлектроннай барацьбы плануюць стварыць новы комплексны від узбраення для барацьбы з беспілотнікамі

**Напярэдадні прафесійнага свята начальнік упраўлення радыёэлектроннай барацьбы Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі палкоўнік Ігар ДАНІЛЬЧЫК падвёў вынікі мінулага навучальнага перыяду, а таксама падзяліўся некаторымі планамі на бягучы год, які ў беларускай арміі пройдзе пад эгідай якасці.**

Найбольш знакавай падзеяй для войск радыёэлектроннай барацьбы сёлета стала ўпершыню праведзенае буйнамаштабнае спецыяльнае вучэнне, у якім былі задзейнічаны ўсе часці і падраздзяленні РЭБ Узброеных Сіл краіны. Не менш важным і адказным было камандна-штабное вучэнне, якое стала выпрабаваннем года для ўсёй беларускай арміі.

— У плане баявой падрыхтоўкі і навучання асабовага складу мы паспяхова выканалі ўсе задачы, якія ставілі перад сабой, — пераканаНы Ігар Данільчык. — Гэта адзначана і вышэйшым кіраўніцтвам, калі многія нашы спецыялісты, афіцэры, прапаршчыкі, сяржанты і салдаты былі заахвочаны як па выніках вучэнняў, так і ў цэлым па выніках года.

Акрамя баявой падрыхтоўкі, шмат увагі надаецца развіццю сістэмы радыёэлектроннай барацьбы. Планамерна ідзе пераасначэнне воінскіх часцей РЭБ на новыя ўзоры ўзбраення. Фактычна завяршылася забеспячэнне сродкамі перашкод радыёнавігацыі, на ўзбраенне пастаўлены новыя сродкі аўтаматызацыі для кіравання падраздзяленнямі. Запланавана пастаўка новых сродкаў перашкод радыёсувязі ўльтракароткага хвалевага дыяпазону, які ў мэтах кіравання ваенізаванымі фарміраваннямі найбольш актыўна выкарыстоўваецца ў любых войнах і лакальных канфліктах.

— Свет не стаіць на месцы: кожны год узнікаюць новыя рызыкі і пагрозы, якія патрабуюць ад нас адпаведнага рэагавання, — адзначыў начальнік упраўлення радыёэлектроннай барацьбы. — У сваім развіцці войскі РЭБ у апошні час шмат увагі надаюць супрацьдзеянню новым сродкам на полі бою. У прыватнасці, беспілотным лятальным апаратам, якія актыўна выкарыстоўваюцца ў шматлікіх мэтах. Як добрых (напрыклад, яны значна аблягчаюць жыццё леснікоў у плане кантролю за пажарнай бяспекай лясных масіваў), так і не зусім. У апошні час беспілотнікі выкарыстоўваюцца з мэтай нанясення паражэння працаўніку падчас тэрарыстычных пагроз, лакальных войнаў і канфліктаў.

Беспілотныя лятальныя апараты — гэта не ноу-хау. Пра іх было вядома даўно, але ніхто нават уявіць не мог, які багаты спектр выкарыстання беспілотнікаў. Малагабарытных, малазаўважных і амаль бясшумных, іх даволі складана выявіць сродкамі супрацьпаветранай абароны. Ды і прыцягваць для іх знішчэння дарагое зенітна-ракетнае ўзбраенне эканамічна не эфектыўна. І ў гэтым выпадку на дапамогу прыходзіць зброя радыёэлектроннай барацьбы.





**Новы комплекс радыётэхнічнай разведкі «Пеленг» беларускай вытворчасці (знутры і знешне).**

Як расказаў Ігар Данільчык, сёлета спецыялісты РЭБ практычна адпрацавалі пытанні процідзеяння з беспілотнымі лятальнымі апаратамі тымі сродкамі, якія ёсць на ўзбраенні. У той жа час вызначылі напрамак, куды ў сваім развіцці ім рухацца далей. У перспектыве запланавана стварыць новы комплексны від узбраення для барацьбы з беспілотнымі лятальнымі апаратамі.

Паспяхова прайшоў выпрабаванні і ўжо прыняты на ўзбраенне новы комплекс радыётэхнічнай разведкі «Пеленг» беларускай вытворчасці, які дазваляе выяўляць і суправаджаць паветраныя крыніцы радыёвыпраменьвання на адлегласці да 450 кіламетраў.

Акрамя таго, у войсках РЭБ праводзіцца работа па мадэрнізацыі сродкаў радыёэлектроннага падаўлення лакацыйных станцый, якія таксама размяшчаюцца на паветраных суднах. А ўсё для таго, каб ва ўмовах баявой абстаноўкі ў самалёта працаўніка не было магчымасці выявіць пэўныя аб'екты на нашай тэрыторыі. Быццам парасонам, спецыялісты радыёэлектроннай барацьбы абараняюць важныя стратэгічныя аб'екты.

— Мы працуем ціха, часам непрыкметна: наша праца бачная толькі на паперы, калі прадстаўляем вынікі радыёразведкі і радыёпадаўлення, — гаворыць начальнік упраўлення радыёэлектроннай барацьбы. — Адчуць працу спецыялістаў РЭБ можна і тады, калі камандзір умоўнага працаўніка не можа на полі бою кіраваць падначаленымі, а яны, у сваю чаргу, не могуць выконваць свае задачы. Калі, маючы зносіны па сродках сувязі, абанент не чуе адказу ад свайго суразмоўцы. Калі ў чалавека, які для вызначэння свайго месца знаходжання выкарыстоўвае радыёнавігацыю, раптоўна знікаюць усе спадарожнікі. Або калі беспілотны апарат або малая авіяцыя губляе арыентацыю ў прасторы.

На бягучы год — усё тыя ж задачы. Заключаны кантракты на пастаўку новых сродкаў радыёэлектроннай барацьбы, на мадэрнізацыю тых, якія ўжо стаяць на ўзбраенні. Баявая падрыхтоўка спецыялістаў радыёэлектроннай барацьбы будзе ўдасканальвацца падчас шматлікіх вучэнняў. З найбольш маштабных — сумеснае вучэнне з войскамі РЭБ Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі, сумеснае стратэгічнае вучэнне ўзброеных сіл Беларусі і Расіі «Захад-2017».

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ З рэдакцыйнай пошты

# Ваенныя хронікі маёй сям'і

**У большасці з нас знойдзецца свая гісторыя пра сваяка — удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, якую можна расказваць у якасці легенды. Прайшлі праз пекла вайны і мае прабабулі, прадзядулі. На шчасце, усе яны вярнуліся дамоў, але кожнаму з іх вайна нанесла глыбокія псіхалагічныя траўмы.**



**Мая прабабуля Марыя ІГНАЦЬЕЎНА.**

Маёй прабабулі, Марыі Ігнацьеўне, — 90 гадоў. У пачатку вайны ёй было ўсяго пятнаццаць! У свае пятнаццаць я нават думаць баюся пра тое, што можа здарыцца падобнае. Прабабуля не можа без слёз успамінаць што-небудзь з таго часу. І яе можна зразумець: кожны раз, калі гаворыць пра вайну, быццам перажывае ўсё зноўку.

Жылі мае сваякі ў невялікай вёсачцы ў Лагойскім раёне. У адзін з асенніх дзён у вёску прыехалі карнікі. Вясковага доктара, які дапамагаў параненым салдатам і партызанам, а таксама ўсіх яго сваякоў, было загадана завесці ў хлеў і спаліць. І да вялікага жаху, мая прабабуля была пляменніцай гэтага лекара. Фашысты былі настолькі бесчалавечнымі, што сагналі ў той хлеў не толькі сям'ю доктара, але і ўсіх безабаронных людзей, якія трапіліся ім на шляху.

Мая прабабуля аказалася там са сваёй сяброўкай. Па яе словах, людзей у хляве было вельмі шмат, усе стаялі блізка адзін да аднаго, не маглі нават паварушыцца. Шанцаў на выратаванне было мала. Але бабуля Маша ўсё ж заўважыла ў сцяне хлява невялікую дзірку, у якую можна было пралезці. Але як гэта зрабіць непрыкметна? Вакол жа стаяць немцы! Вылезеш — расстраляюць. Любая спроба ўцячы здавалася немагчымай і абсалютна бессэнсоўнай. Але, калі хлеў пачаў гарэць, учынкамі людзей кіраваў выключна страх смерці. А жыць хацелася ўсім...

Маёй прабабулі ўдалося вылезці праз гэтую адтуліну. Магчыма, з-за маленькага росту і сваёй хударлявасці яна засталася не заўважанай карнікамі і схавалася ў лесе. Здаецца, вось яно — шчасце. Толькі бабуля Маша і дагэтуль плача, што не змагла выратаваць сваю сяброўку, кагосьці яшчэ.

Падчас вайны прабабуля дапамагала партызанам. Пераадольваючы за дзень па 20 і больш кіламетраў, перадавала ім ежу, вопратку, іншыя неабходныя рэчы. Лёс быў добразычлівым да яе: бабулі пашчасціла не трапіць у канцлагер. Аднак гітлераўцы прымушалі дзяцей і падлеткаў да фізічнай працы. Бабуля Маша, напрыклад, доўгі час высякала лес, які адпраўлялі ў Нямеччыну.

...Адзін з маіх прадзедаў, Уладзімір Герасімавіч, служыў у танкавых войсках, дайшоў да Германіі. На гэтым нялёгкім шляху знішчыў мноства варожай тэхнікі. Іншы прадзед, Філіп Дарафеевіч, будучы машыністам санітарнага цягніка, перавозіў параненых салдат. Прабабуля Ганна Максімаўна ў гэтым жа цягніку працавала медсястрой, выратавала не адно жыццё.

І гэта толькі гісторыя маёй сям'і. А іх, закранутых Вялікай Айчыннай вайной, было шмат. Як і загубленых лёсаў.

**Дарыя ГАЛОЎЧЫЦ,**
**вучаніца 10 класа СШ № 54 г. Мінска**

# ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

напалонных. Падчас пошукавых работ было знойдзена 76 медальёнаў. Але не ўсе з такіх рэдкіх і каштоўных сёння знаходак далі адказ на самае галоўнае пытанне — каму яны належалі?

Большасць «смяротных медальёнаў», як называюць эбанітавыя капсулы з інфармацыяй аб вайскоўцы, былі пустымі, паламанымі, раскрышанымі, без каўпачкоў. У выніку даследавання ўкладышаў устанавілі 23 прозвішчы вязняў лагера. Яшчэ адно імя вызначылі дзякуючы надпісу на адной з суправаджальных знаходак — ваеннапалонны, які ляжаў у шпіталі пры лагеры, надрапаў сваё імя на каробачцы для таблетак германскай вытворчасці.

Пакуль удалося выйсці на сваякоў васьмі загінулых у шталагу. На ўрачыстае перапахаванне астанкаў, яне адбылося на Аляксееўскіх могілках, што пад Барысавам, прыехалі сем'і чатырох ваеннапалонных. Каб адправіцца у апошні шлях тых, каго яны шукалі больш чым 70 гадоў, многія пераадолелі тысячы кіламетраў. Сваякі воінаў, якія да нядаўняга часу лічыліся без вестак зніклымі, прыехалі ў Беларусь з Казані, Цюмені, Масквы, Разанскай вобласці. Усе яны былі ўпершыню ў краіне, зямля якой назаўжды прытуліла іх продкаў.

— Бабуля ўсё жыццё чакала, — ледзь стрымліваючы слёзы, гаворыць унучка Андрэя Андрэйчанкі, вязня «Шталага 382». — Да апошняга верыла, што ён жывы...

У Барысаў Наталля Помалева прыляцела з Цюмені разам з маці, дачкой ваеннапалоннага. Перад тым, як трапіць у лагер, старшы сяржант Андрэй Андрэйчанка, ураджэнец Кіравагградскай вобласці, праходзіў звыштэрміновую службу ў якасці аўтатэхніка ўзвода аднаго з дывізіёнаў Заходняга фронту. У які час ён апынуўся ў шталагу, невядома.

— Калі дзядуля пайшоў на фронт, у яго было адно дзіця — мой дзядзька, — расказвае Наталля Помалева. — У той час бабуля якраз была цяжарная маёй маці. Але сваю адзіную дачушку ён так і не пабачыў...

Не змог выхаваць сваіх шасцярых дзяцей і ўраджэнец Татарскай АССР Хідзітч Ягудзін. Больш за тое, толькі адна дачка дачакалася навіны, якая зняла ўсе пытанні аб бацькавым лёсе. Нягледзячы на свой узрост (а Тамбіры Хасанавай — 83 гады), жанчына прыехала ў Беларусь. І не толькі, каб пабачыць, дзе абарвалася жыццё бацькі, і назаўжды развітацца з ім, а і набраць зямлі з магілы, дзе ляжаць яго астанкі. Гэтую жменю памяці па вяртанні дамоў яна пакладзе на магіле маці, якая ўсё жыццё была верная свайму мужу. А той, між іншым, прайшоў тры вайны. З апошняй яму не наканавана было вярнуцца.

Як і радавому Васілю Гардзееву. Аб тым, што іх родны дзядзька са спісу зніклых без вестак, дзе значыўся яшчэ з 1941-га года, залічаны ў спіс загінулых за Радзіму, Тацця-на і Юрый даведаліся адным з апошніх. Да ўрачыстага перапахавання вязняў заставалася ўсяго некалькі дзён, але тыя, нават не раздумваючыся, выправіліся ў дарогу з далёкага Татарстана. Сімвалічна, што брат радавога Гардзеева таксама загінуў у Беларусі. Пляменнікі гавораць, што было гэта дзесьці пад Гомелем. Іх бацьку, трэцяму Гардзееву, пашчасціла больш: той з вайны вярнуўся.

— Мой дзед, Фёдар Сяміткін, пайшоў на фронт у жніўні 1941-га, — расказвае ўнук ваеннапалоннага Валерый Ягораў, які прыехаў у Барысаў разам з пляменнікам. — Дзесьці ў сярэдзіне верасня ад яго прыйшоў ліст, у якім ён напісаў, што заўтра ідзе ў бой. А ў снежні 1942 года афіцыйна паведамілі, што дзед знік без вестак. Больш пра яго мы нічога не ведалі.

Але так было да кастрычніка гэтага года. Менавіта восенню ў кватэры дачкі салдата, маці Валерыя Ягорава, раздаўся званок з доўгачаканай навіной. Жанчына быццам прадчувала гэта. Не інакш, як містыкай, гэта не назавеш. Напярэдадні дачка Фёдара Сяміткіна ўбачыла сон, у якім да яе прыехала нейкая жанчына — ці то з Беларусі, ці то з Польшчы — і прывезла бацькавы рэчы. Тое, што сон прарочы, зразумелі праз некалькі тыдняў.

На цырымонію ўрачыстага перапахавання дачка Фёдара Сяміткіна па стане здароўя прыехаць не змагла. Але на Аляксееўскія могілкі яе прывязуць на машыне летам. Калі наведаць магілу продка ў наступны раз, плануюць ўжо і іншыя сваякі загінулых вязняў.

Агульнае гора, якое аб'ядноўвала кожнага з тых, хто прыехаў, у адно імгненне зрабіла нашу зямлю для іх надзвычай роднай. Зямлю, якая на працягу доўгіх гадоў была для ваеннапалонных канцлагера брацкай магілай. Зямлю, на якой яны апынуліся другі раз, але ўжо пад гукі ваеннага аркестра і малітву святароў. А самае галоўнае — у прысутнасці сваіх нашчадкаў, дзеля якіх ахвяравалі сабой.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
*Барысаўскі раён*